# МОЙ ВЕЛІСТРУХЕН З'ЕЛА МОЛЬ

## «Аня малявала гусей, а я пачаў нешта раіць»

***— У вас, я гляджу, патрыярхат. На сценах толькі карціны Васіля...***

**В.:** Толькі ў гэтым пакоі *(усміхаецца)*. Калі завітаеце ў спальню, пакой Машы — убачыце выключна Аніны работы.

**Г.:** Доўгі час у нас у кватэры карцін не было зусім. Прынцыпова не развешвалі. Каб не было такога, што прыходзіш з майстэрні — а дома ўсё тое ж самае. Пачалося з таго, што Маша папрасіла павесіць у яе пакоі маю карціну...

**М.:** З дзяўчынкай з рудымі валасамі і зайцам.

**Г.:** Яна на той момант была прададзена. Таму павесілі іншую — з совамі. А дзе адна карціна — там і дзве...

**В.:** Цяпер мне нават падабаецца. Ляжу на канапе і на вёску сваю гляджу. Там я ў дзяцінстве кожнае лета праводзіў. І зараз ахвотна туды ездзім, у госці да майго дзядулі, яму 87.

**М.:** Зараз там няма чаго рабіць. Адзін сабака памёр. Другога — аддалі. Ніякіх жывёл няма, акрамя курэй. А яны ўцякаюць. Іх нават не абдымеш.

***— Аня, Васіль, наколькі ведаю, вы пазнаёміліся падчас вучобы ў Акадэміі мастацтваў. Гэта было каханне з першага позірку?***

**В.:** Не. Я адчуў, што Аня «мой чалавек» недзе праз паўгода. Памятаю, калі ўпершыню звярнуў на яе ўвагу. Аня пісала кампазіцыю. Я падышоў, пачаў нешта раіць. Я быў крыху старэйшы, паступіў у Акадэмію пасля мастацкага вучылішча, якое скончыў з чырвоным дыпломам. Яна паківала галавой і зрабіла па-свойму. Як заўсёды *(смяюцца)*.

***— А памятаеце, што Аня малявала ў той момант?***

**В.:** Там быў вясковы матыў, што мяне, дарэчы, і прыцягнула. Бялізна, якая развявалася на ветры, а побач жанчына гнала гусей.

**Г.:** А я ніколі не забудуся на нашыя першыя зімовыя канікулы. Паехалі з Васем у Гомель. Тады я ўпершыню ў жыцці схадзіла з ім на зімнія эцюды. Змерзла жудасна. Азяблымі рукамі штосьці намалявала. І пасля скакала вакол Васі: «Пайшлі хутчэй у кавярню, грэцца». А ён: «Пачакай, я яшчэ крыху памалюю».

**В.:** Я тады намаляваў карціну 60х40. Палац Паскевічаў.

**Г.:** Такая вось рамантычная прагулка. Больш я такія запрашэнні не прымаю *(смяецца)*.

**В.:** Але ж гарбатай я цябе ўсё ж такі напаіў тады.

***— Кажуць, галоўнае для дзяўчыны паспяхова выйсці замуж. Пад «паспяхова» ўсе разумеюць, як правіла, каб у мужа была кватэра, машына... А для вас, Аня, што значыць паспяхова выйсці замуж?***

**Г.:** Я выйшла замуж у 21 год. Прайшло 14 гадоў, і я па-ранейшаму задаволена сваім выбарам. Многія лічаць, што мець мужа-мастака не вельмі добра. Лепш бізнесмена, каб шмат грошай у сям'ю прыносіў. Для мяне важна, каб былі агульныя інтарэсы, каб чалавеку, які побач, было цікава, чым я займаюся.

## «Аднакласнікі зайздросцяць, што ў мяне бацькі — мастакі»

***— А ты, Маша, як лічыш, пашанцавала табе з бацькамі?***

**М.:** У школе ўсе зайздросцяць, што ў мяне бацькі — мастакі. Калі трэба плакат намаляваць, то адразу мне даручаюць. Маўляў, у мамы ці таты спытаеш, як зрабіць. Я таксама спрабую маляваць. Не заўсёды, канешне, хочацца. Але добра, калі ёсць хтосьці, хто параду дасць.

***— Бачыла ў «Фэйсбуку», што ты сваю першую карціну прадала не так даўно?***

**М.:** Нядаўна ў Палацы мастацтваў была ялечная выстава. Там былі мамы, татавы і мае работы. Падышла цёця і купіла ў мяне адну карціну. А пасля яна знайшла мяне ў інтэрнэце. Напісала, што карціна спадабалася дачцэ. І што заўтра падыдзе і купіць яшчэ адну.

***— Што ты адчувала ў той момант?***

**М.:** Мне, канешне, было шкада карцін. Бо не хочацца расставацца. Але ж засталіся фотаздымкі.

**Хацелася б вялікую майстэрню-галерэю-студыю. Каб людзі, якія ішлі міма, маглі б зайсці ў госці, паглядзець новыя работы, папіць гарбаты і пагутарыць. Ну і каб там можна было праводзіць розныя цікавыя майстар-класы.**

***— Маша, твае работы больш падобныя на маміны, чым на татавы...***

**Г.:** Гэта проста ад таго, што я з ёй займаюся. Вася не можа адначасова і працаваць, і парады даваць. Пару разоў яны з Машай на эцюды хадзілі, але гэта звычайна заканчваецца аднолькава. Спачатку спрабуе ўдзельнічаць, а пасля акунаецца ў сваю работу і ўсё...

**В.:** У нас так: сюжэт Анін, а тэхніка мая. Маша любіць з цюбіка шмат фарбы выціснуць. Можа, проста не ведае, колькі яна каштуе *(смяюцца)*. Раней, калі Машы было 3 гадзікі, я ёй даваў палатно, фарбы. Яна фон рабіла. Я ж пасля дапрацоўваў. А неяк было так, што я пісаў вялікую работу — макі. Даў ёй пэндзлік: «На, ты паспрабуй». Яна ўзяла яркую фіялетавую фарбу і раз-раз мазнула. Гляджу, якраз гэтага колеру і не хапала. І дарабляў фіялетавым. Атрымалася вельмі ўдала.

***— Маша, раней ты казала, што ў цябе зацякае рука, калі малюеш,***



Марыя Васілеўна ўпершыню прадала сваю карціну! На заднім плане работы Ганны Сілівончык.

***таму ты ніколі не будзеш мастаком. Прайшоў не адзін год. А ты працягваеш маляваць...***

**В.:** Мама прымушае. Часам нічога не застаецца, як брацць за шкірку і цягнуць у майстэрню.

**М.:** Гэта вобразна *(смяюцца)*.

**В.:** Даводзіцца неяк матываваць. Аня плаціць 100 тысяч за кожную закончаную карціну.

**Г.:** Я з Машай стала сур'ёзна займацца толькі год таму. Доўга чакала, што ў яе праражацца да чаго-небудзь ярка выражаны інтарэс. Не дачакалася. Думаю, а раптам гэтага і не здарыцца, калі столькі спакус вакол...

***— Вам бы хацелася, каб дачка пайшла па вашых слядах, стала мастачкай?***

**Г.:** Не магу сказаць, што вельмі гэтага хачу. Проста гэта адзінае, чаму я яе сама магу навучыць. Тым больш бачу, што здольнасці ёсць, чаму б іх не развіваць. Лічу, гэта няблага, як адзін з кірункаў развіцця. Маша ж яшчэ займаецца ў тэатральнай студыі.

## «Дагэтуль часам з Васем размаўляем на Машынай мове»

***— Учора перад сном паглядзела ваш спектакль пра конікаў, у якіх ад кахання выраслі крылы (відэа глядзіце на сайце «Звязды». — Аўт). І запісалася ў ваш фан-клуб. А чаму свой сямейны тэатр ценяў назвалі «Велiструхен»? Што гэта за слова такое?***

**М.:** Наогул, няма такога слова. Я глядзела мульцік. Там была песня. Я няправільна зразумела сэнс. Бегала па кватэры і спявала: «Мой Веліструхен з'ела моль». А там быў смокінг наогул. Проста пераблытала словы. Маме з татам вельмі спадабалася. І яны хацелі назваць гэтым словам штo-небудзь. А пасля, калі думалі, як назваць сямейны тэатр ценяў, узгадалі гэта слова і назвалі яго так.

**Г.:** «Веліструхен» — гэта сімвал спантаннай творчасці. Дзеці вельмі часта несвядома прыдумляюць наватворы. Маша ў дзяцінстве нейкія словы перайначвала, перакручвала. У нас іх цэлая калекцыя. Дагэтуль часам з Васем размаўляем на Машынай дзіцячай мове.

**В.:** Ідзі, прынясі «хахоні» — шкарпэткі, «какокі» — калготкі, «камкана» — смятана...

***— Наколькі важна, каб у сям'і было агульнае захапленне?***

**Г.:** Гэта яднае. Сямейнае хобі з'явілася, у першую чаргу, дзеля Машы. У яе з дзяцінства інтарэс да кіно. Але паколькі фільм здымаць у хатніх умовах складана, прыдумалі хатні тэатр. Каб развіць Машыны здольнасці і адцягнуць яе ўвагу ад камп'ютара, дурацкіх мульцікаў.

**В.:** У нас ролі размеркаваныя. Маша агучвае.

**Г.:** А мы з Васем кіруем лялькамі. У асноўным спектаклі ставім па маіх казках. Адзін — па Машынай зрабілі. Я яе крыху адаптавала пад тэатр ценяў. Лялькі таксама, у асноўным, раблю я. З задавальненнем паказваем свае міні-спектаклі сваім сябрам у майстэрні ці дома. Калі запрашаюць, і іншым дзеткам.

***— Як любіце бавіць час сям'ёй?***

**Г.:** Любім вандраваць.

**М.:** А на Новы год у нас збіраюцца маміны і татавы сябры з дзецьмі. Мама прыдумвае асобую тэматыку: напрыклад, чараўнікі, Індыя. Кожны з гасцей рыхтуе конкурс, прыз. Да ранку не спім, гуляем, танцуем. Вельмі весела. Таму маё любімае свята Новы год.



Новы год — 2016: у стылі сюррэалізму.

## «Іду зялёная па вуліцы — а ўсе азіраюцца»

***— Вы ўсе разам працуеце ў майстэрні?***

**В.:** Наша майстэрня — самая звычайная двухпакаёвая кватэра. Яна тут, непадалёку. У адным пакоі Аня працуе...

**М.:** Са мной.

**В.:** А ў другім — я.

**Г.:** У Васі пакой большы. Ён выстаўляе нацюрморты. І акно яму большае патрэбна для асвятлення.

**М.:** А хутка, калі мы пераедзем, у мяне будзе свая майстэрня.

**В.:** Мы прадалі гэту кватэру і майстэрню. Неўзабаве пераедзем з Каменнай Горкі ў цэнтр горада — на Веры Харужай. У новай кватэры мы вырашылі адзін пакой выдзеліць пад дамашнюю майстэрню. Бо Машы пасля школы...

**М.:** Мне часам проста не хочацца ісці ў майстэрню, таму што я вельмі брудная, калі малюю. Твар, ногі — усё зялёнае. У майстэрні няма ванны, толькі ўмывальнік маленькі. Там моцна не адмыешся. Таму я з зялёнымі рукамі, нагамі, тварам вымушана вяртацца дадому — а ўсе азіраюцца.

**В.:** Не разумею, чаму ты так выпэцкваешся...

**М.:** Я проста вельмі актыўна і прыгожа малюю!

***— Чаму вырашылі пераехаць жыць у цэнтр горада?***

**В.:** Гэта Аніна мара.

**Г.:** Мы любім хадзіць на выставы. Яны ж усе ў цэнтры горада. А з Каменнай Горкі пакуль дабярэшся... Часу шкада на дарогу.

***— Мо марыце пра сямейную галерэю?***

**Г.:** Хацелася б вялікую майстэрню-галерэю-студыю. Каб людзі, якія ішлі міма, маглі б зайсці ў госці, паглядзець новыя работы, папіць гарбаты і пагутарыць. Ну і каб там можна было праводзіць розныя цікавыя майстар-класы, сустрэчы, спектаклі. Але ж гэта не так проста арганізаваць. Як падумаю, што трэба будзе на адміністрацыйныя справы страчваць свой час, які хацелася б удзяляць творчасці...

## «Я не так сур'ёзна выглядаю, як хацелася б маёй маме»

***— Ганна, мяркуючы па вашых карцінах, вы вельмі свабодалюбівы чалавек. Наколькі важна для вас свабода ўзаемаадносін у сям'і?***

**Г.:** Пасля акадэміі я нікуды не пайшла працаваць, бо для мяне было вельмі важна, каб не было нада мной начальніка, які б мне ўказваў, што і як маляваць. І ў сям'і важна ўлічваць інтарэсы кожнага. Вася ездзіць на пленэры, мне ў галаву не прыйдзе яго абмяжоўваць: «Сядзі дома. Навошта табе гэта?» Тое ж самае і ён: дапамагае мне з выставамі, праектамі. Машыны жаданні, калі яны не зусім вар'яцкія, стараюся дапамагчы ажыццявіць.

**М.:** Я хацела сабе ў новай кватэры чорныя шпалеры. Цалкам чорны пакой. А тата супраць.

**Г.:** Вася не любіць цёмных колеры ў інтэр'еры. Але хоча чалавек, што тут такога. У выніку мы прыйшлі да кампрамісу: дзве сцяны зробім чорнымі, дзве — блакітнымі.

***— Ганна, Васіль, якімі вы сябе ўяўляеце ў старасці? Такімі, як на адной карціне Сілівончык, дзе пажылая парачка едзе на матацыкле. Ці іншымі?***

**Г.:** Мне больш імпануюць бабулі і дзядулі, якія вандруюць, чым тыя, што толькі ў градках сядзяць ці дома на канапе з газетай. Я гляджу на сваіх бацькоў. Ёсць грошы, магчымасць некуды паехаць, але тата мой ні разу не быў за мяжой. І яму нават не хочацца. У любым узросце трэба старацца атрымліваць ад жыцця задавальненне, тады і людзям будзе добра побач з вамі.

**Вася ездзіць на пленэры, мне ў галаву не прыйдзе яго абмяжоўваць: «Сядзі дома. Навошта табе гэта?»**

***— І будзеце апранацца гэтак жа ярка, як цяпер?***

**Г.:** Аня — будзе. Часам бачу якуюнебудзь бабулю з рудымі валасамі і сінімі ценямі, якая прытанцоўвае. «О, — кажу Ані, — гэта ты ў будучыні». Я ж буду спакойны, больш класічны.

***— А бацькі як ставяцца да вашай творчасці, ладу жыцця?***

**Г.:** Мама мая адзін час перажывала, што мы нідзе не працуем афіцыйна. «А як жа пенсія?» Ёй складана гэта зразумець, яна ж усё жыццё прапрацавала дзяржслужачай, займала кіруючыя пасады. Доўгі час нават у адпачынак не хадзіла. А пасля зразумела, што і так можна нармальна жыць. Цяпер дабралася да інтэрнэту, сацыяльных сетак. Перажывае, калі нехта дрэнны каментарый пакіне на маёй старонцы. А нядаўна ўбачыла мяне на прэзентацыі ў фіялетавых калготках. «Ты ўжо не ў тым узросце, кажа, калі можна надзяваць такія рэчы. Пойдзем купім прыстойныя касцюм, туфлі на абцасе». Можа быць, я не так сур'ёзна выглядаю, як хацелася б маёй маме. Але я такая, і мне гэта падабаецца.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота Надзеі БУЖАН і з сямейнага архіва герояў.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*